**ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ**
**НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ**

**П Р А Г Р А М А**
**Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі**

# Вынікі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі ў 2023 годзе.

Да 100-годдзя з дня нараджэння Л. Д. Побаля
і 140-годдзя С. А. Дубінскага



**22–24 мая 2024 г.**

**Мінск – в. Гарадзішча – в. Азярцо – Мінск**



Візіт Першага намесніка Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь І .В. Петрышэнкі на археалагічны комплекс на р. Менцы і знаёмства з вынікамі археалагічных даследаванняў, 12 ліпеня 2023 г.



Візіт Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь Р. А. Галоўчанкі на археалагічны комплекс на р. Менцы і знаёмства з вынікамі археалагічных даследаванняў Інстытута гісторыі НАН Беларусі, 9 верасня 2023 г.

**АРГКАМІТЭТ**
**Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі**
**«Вынікі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі ў 2023 г.»**
**Канферэнцыя праводзіцца ў гонар 100-годдзя з дня нараджэння**
**Л. Д. Побаля і 140-годдзя з дня нараджэння С. А. Дубінскага**

*Лакіза Вадзім Леанідавіч* – дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (старшыня);

*Аўласовіч Аляксей Міхайлавіч* – загадчык цэнтра археалогіі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (намеснік старшыні);

*Атрохаў Дзяніс Анатольевіч* – лабарант першай кваліфікацыйнай катэгорыі аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу (тэхнічны сакратар);

*Вайцяховіч Андрэй Вячаслававіч* – загадчык аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

*Ганчарэнка Кірыл Дзмітрыевіч* – намеснік дырэктара па агульных пытаннях Інстытута гісторыі НАН Беларусі;

*Касцюкевіч Анастасія Уладзіміраўна* – загадчык аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук;

*Кошман Вадзім Іванавіч* – вядучы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

*Пруднікаў Павел Мікалаевіч* – юрысконсульт Інстытута гісторыі НАН Беларусі;

*Трубчык Павел Анатольевіч* – намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

*Чарняўскі Максім Міхайлавіч* – загадчык аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук.

**Партнёры канферэнцыі**
Беларускі дзяржаўны музей архітэктуры і побыту
Навуковая, вытворча-практычная газета Беларусі «Навука»

*Фотаздымак на вокладцы: кісцень XI ст. з гарадзішча на р. Менка (Мінскі раён)*
*(даследаванні пад навуковым кіраўніцтвам А.В. Вайцяховіча, 2023 г.)*

Запрашаем наведаць археалагічную навукова-музейную экспазіцыю Інстытута гісторыі НАН Беларусі і далучацца ў якасці валанцёраў да археалагічных раскопак на гарадзішчы на р. Менцы
*г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1, тэл. +375 17 3791834 / +375 17 3789093*

## Парадак працы канферэнцыі

***22 мая 2024 г.***

***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск, вул. Акадэмічная 1)***

| | |
|---|---|
| 9.00 – 9.30 | Рэгістрацыя ўдзельнікаў канферэнцыі |
| 9.30 – 12.30 | Пленарнае пасяджэнне |
| 12.30 – 13.00 | Абед |
| 13.00 | Выезд у в. Гарадзішча (Мінскі раён) на археалагічны комплекс на р. Менка |
| 14.00 – 16.00 | Выяздное пасяджэнне. Археалагічная выстава. Абмеркаванне плана даследаванняў на археалагічным комплексе на р. Менка |
| 16.30 | Выезд у в. Азярцо (Мінскі раён) |
| 16.45 – 18.00 | Наведванне Беларускага дзяржаўнага музея архітэктуры і побыту |

***23 мая 2024 г.***

***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск, вул. Акадэмічная 1)***

| | |
|---|---|
| 9.30 – 13.00 | Працяг пленарнага пасяджэння |
| 11.00 – 11.20 | Перапынак |
| 11.20 – 13.00 | Працяг пленарнага пасяджэння |
| 13.00 – 14.00 | Абед |
| 14.00 – 18.00 | Працяг пленарнага пасяджэння |

***24 мая 2024 г.***

***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск, вул. Акадэмічная 1)***

| | |
|---|---|
| 9.30 – 13.00 | Працяг пленарнага пасяджэння |
| 11.00 – 11.20 | Перапынак |
| 11.20 – 13.00 | Працяг пленарнага пасяджэння |
| 13.00 – 14.00 | Абед |
| 14.00 – 17.30 | Працяг пленарнага паседжання, падвядзенне вынікаў работы і закрыццё канферэнцыі |

**Рэгламент працы:** выступленні з дакладамі – да 15 хвілін
**Працоўныя мовы:** беларуская, руская

**22 мая 2024 г.**
**Адкрыццё канферэнцыі і пленарнае пасяджэнне**
**9.30 – 12.30** (Інстытут гісторыі НАН Беларусі, пак. 223)

**Мадэратары**
***Аўласовіч Аляксей Міхайлавіч** – загадчык цэнтра археалогіі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт; **Кошман Вадзім Іванавіч** – вядучы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;*

*Прывітальнае слова да ўдзельнікаў канферэнцыі дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдата гістарычных навук, дацэнта **Лакізы Вадзіма Леанідавіча***

**Даклады**

**Лакіза Вадзім Леанідавіч** – дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт; **Вайцяховіч Андрэй Вячаслававіч** – загадчык аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт; **Аўласовіч Аляксей Міхайлавіч** – загадчык цэнтра археалогіі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«О результатах исследований археологического комплекса на р. Менке в 2023 г. и принятых мерах по организации исследований данного объекта в 2024 г.»*

**Коваль Уладзімір Юр'евіч** – загадчык аддзела сярэднявечнай археалогіі Інстытута археалогіі РАН, кандыдат гістарычных навук (Расійская Федэрацыя, Масква)

Тэма даклада: *«Методические проблемы при проведении раскопок средневековых валов»*

**Мядзведзева Марыя Уладзіміраўна** – загадчык навуковага архіва Інстытута гісторыі матэрыяльнай культуры РАН, кандыдат гістарычных навук; **Собалеў Уладзіслаў Юр’евіч** – старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі археалогіі гістарычнай сацыялогіі і культурнай спадчыны СПбДУ (Расійская Федэрацыя, Санкт-Пецярбург)

Тэма даклада: *«С. А. Дубинский в ГАИМК. Портрет ученого на фоне эпохи»*

**Калядзінскі Леанід Уладзіміравіч** – старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Леонид Давыдович Поболь: руководитель, полевой работник и человек в моих воспоминаниях»*

**Пачобут Наталля Аляксандраўна** – старшы навуковы супрацоўнік аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны, кандыдат гістарычных навук (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Праекты і дзейнасць Леаніда Давыдавіча Побаля па стварэнні археалагічных музеяў у Беларусі»*

**Лакіза Вадзім Леанідавіч –** дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Белорусская археология в 2023 г. и перспективы выполнения концепции национальных археологических проектов»*

**Аўласовіч Аляксей Міхайлавіч** – загадчык цэнтра археалогіі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Беларусь, Мінск); **Логвінава Дар'я Сяргееўна** – настаўнік гісторыі ДУА «Сярэдняя школа №4 г. Чэрвеня» (Беларусь, Чэрвень)

Тэма даклада: *«Дохристианские захоронения в окрестнастях летописного Друцка»*

**Юрчак Дзяніс Валер'евіч** – галоўны спецыяліст аддзела работы арганізацый сферы культуры ўпраўлення культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Беларусь, Віцебск)

Тэма даклада: *«Да пытання ўдакладнення лакалізацыі асобных помнікаў археалогіі Полацкага раёна, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь»*

**Перапынак на абед 12.30 – 13.00**

**13.00 – 14.00 – пераезд у в. Гарадзішча Мінскі раён**

**Выяздное пасяджэнне на археалагічнгым комплексе на р. Менцы. Археалагічная выстава. Абмеркаванне плана даследаванняў на 2024 г. в. Гарадзішча, Мінскі раён.**

**14.00 – 16.00**

**Даклады**

**Вайцяховіч Андрэй Вячаслававіч** – загадчык аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада*: «Навуковае значэнне даследаванняў археалагічнага комплекса на р. Менцы ў 2023 г.»*

**Знаёмства з навейшымі артэфактамі.**
**Экскурсія па археалагічным комплексе на р. Менка.**

**Наведванне Беларускага дзяржаўнага музея архітэктуры і побыту. в. Азярцо, Мінскі раён.**

**16.30 – 18.00**

**23 мая 2024 года**
(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, пак. 223)

**Працяг пленарнага пасяджэння**
**09.30 – 13.00**

**Мадэратары**
***Крывальцэвіч Мікалай Мікалаевіч*** *– вядучы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук;* ***Пачобут Наталля Аляксандраўна*** *– старшы навуковы супрацоўнік аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук;*

**Мядзведзева Вольга Уладзіміраўна** – вядучы навуковы супрацоўнік цэнтра гісторыі навукі і архіўнай справы Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук (Беларусь, Мінск)
Тэма даклада: *«Леанід Давыдавіч Побаль: да 100-годдзя з дня нараджэння»*

**Вашанаў Аляксандр Мікалаевіч** – навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі (Беларусь, Мінск); **Ткачова Марыя Іванаўна** – навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі (Беларусь, Мінск); **Шадыра Вадзім Іосіфавіч** – вядучы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Беларусь, Мінск)
Тэма даклада: *«Вынікі даследаванняў помніка Клішына-3 (Крупскі раён, Мінская вобласць) у 2023 г.»*

**Крывальцэвіч Мікалай Мікалаевіч** – вядучы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук (Беларусь, Мінск)
Тэма даклада*: «Кераміка WLT-тыпу культуры шнуравой керамікі на тэрыторыі Беларусі»*

**Ліневіч Сяргей Барысавіч** – навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, магістр гістарычных навук (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Каменные сверленые втульчатые топоры с территории Беларуси и соседних регионов»*

**Чарняўскі Максім Міхайлавіч** – загадчык аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Даследаванні на Паўночнай Беларусі ў 2023 г.»*

**Ткачоў Алег Юр'евіч** – навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Вынікі палявых археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 2023 г.»*

**Велент-Шчэрбач Святлана Сяргееўна** – навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Група помнікаў Панямонь – гісторыя вывучэння і перспектывы даследаванняў»*

**Крывальцэвіч Мікалай Мікалаевіч** – вядучы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада*: «Новыя знаходкі металічных вырабаў эпохі бронзы з басейна нізоўяў Бярэзіны»*

**Кошман Вадзім Іванавіч** – вядучы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Беларусь, Мінск); **Кунаш Аляксандр Алегавіч** – навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі (Беларусь, Мінск); **Віннікава Валянціна Яўгенаўна** – малодшы навуковы супрацоўнік аддзела антрапалогіі Інстытута гісторыі НАН Беларусі (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Выратавальныя археалагічныя работы на тэрыторыі былых могілак у г. Дзяржынску Мінскай вобласці ў 2023 г.»*

**Клімаў Марат Васільевіч** – старшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: «*Археалагічнае даследаванне ва Ушацкім і Полацкім раёнах»*

**Ліндзянкоў Дзмітрый Мікалаевіч** – намеснік дырэктара музея па навуковай працы ДГКУ «Гомельскага палацава-паркавага ансамбля» (Беларусь, Гомель)

Тэма даклада*: «Погребальный инвентарь кургана-1 могильника Курганье Жлобинского района (по материалам первых раскопок В. В. Богомольникова и музейным коллекциям)»*

**Кошман Вадзім Іванавіч** – вядучы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Беларусь, Мінск); **Кунаш Аляксандр Алегавіч** – навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Выратавальныя археалагічныя работы ў гістарычным цэнтры г. Слуцка ў 2023 г.»*

**Ткачова Марыя Іванаўна** – навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Вопыт распрацоўкі праектаў зон аховы помнікаў археалогіі Глускага раёна Магілёўскай вобласці: праблемныя пытанні і падводныя камяні»*

**Велент-Шчэрбач Святлана Сяргееўна** – навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Помнікі археалогіі Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці – абследаванне тэрыторыі ГКК і распрацоўка праектаў зон аховы»*

**Перапынак на абед**
**13.00 – 14.00**

**Працяг пленарнага пасяджэння**
**14.00 – 18.00**

**Мадэратары**
***Чарняўскі Максім Міхайлавіч** – загадчык аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук; **Няклюдава Таццяна Анатольеўна** – навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі*

**Пачобут Наталля Аляксандраўна** – старшы навуковы супрацоўнік аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны, кандыдат гістарычных навук (Беларусь, Мінск); **Мядынцава Альбіна Аляксандраўна** – вядучы навуковы супрацоўнік аддзела сярэднявечнай археалогіі Інтытута археалогіі РАН, доктар гістарычных навук, прафесар (Расійская Федэрацыя, Масква); **Пяскова Анна Анісімаўна** – старшы навуковы супрацоўнік аддзела славяна-фінскай археалогіі Інстытута гісторыі матэрыяльнай культуры РАН, кандыдат гістарычных навук (Расійская Федэрацыя, Санкт-Пецярбург)

Тэма даклада*: «Кадило из храма на окольном городе древнего Турова (по материалам раскопок П. Ф. Лысенко 2005 г.)»*

**Шадыра Вадзім Іосіфавіч –** вядучы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Вывучэнне жалезнага веку Беларусі на рубяжы XX-XXI ст.»*

**Сахончык Алег Дзмітрыевіч** – старшы выкладчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта БДУ (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Разведкі каля в. Дубай Столінскага раёна»*

**Варацінская Ларыса Сяргееўна** – навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Усходняй Еўропы і Сібіры Дзяржаўнага Эрмітажа (Расійская Федэрацыя, Санкт-Пецярбург); **Драбушэўскі Аляксандр Іванавіч** – навуковы супрацоўнік Веткаўскага музея стараверства і беларускіх традыцый ім. Ф.Р. Шклярава, кандыдат гістарычных навук (Беларусь, Ветка)

Тэма даклада: *«Исследования зарубинецкого могильника Горошков в 2023 г.»*

**Бяліцкая Ганна Мікалаеўна** – навуковы супрацоўнік аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны Інстытута гісторыі НАН Беларусі (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Аб зменах у класічнай стылістыцы зарубінецкай культуры Прыпяцкага Палесся на рубяжы н.э.»*

**Хвашчынская Наталля Вадзімаўна** – вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі матэрыяльнай культуры РАН, кандыдат гістарычных навук (Расійская Федэрацыя, Санкт-Пецярбург); **Грыгор'ева Вольга Уладзіміраўна** – навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі матэрыяльнай культуры РАН (Расійская Федэрацыя, Санкт-Пецярбург)

Тэма даклада: *«Раннесредневековая крепость на Рюриковом городище в контексте изучения древнерусской фортификации»*

**Міхайлава Анастасія Мікалаеўна** – магістрант Нацыянальнага даследчага ўніверсітэта «Высшая школа эканомікі» (Расійская Федэрацыя, Пермь)

Тэма даклада: *«Пространственный анализ поселенческой структуры носителей пражской и лука-райковецкой культур на территории Белорусского Полесья (конец IV–IX вв.)»*

**Дубіцкая Наталля Мікалаеўна** – старшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада*: «Могильники Гомельского и Могилёвского Поднепровья V-VII вв. Погребальная обрядность»*

**Коц Аляксей Леанідавіч** – старшы выкладчык кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай (Беларусь, Полацк); **Магалінскі Ігар Уладзіміравіч** — дацэнт кафедры сацыяльных камунікацый Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Беларусь, Полацк)

Тэма даклада: *«Селішча пры гарадзішчы старажытнага Полацка: папярэднія вынікі археалагічных даследаванняў на пляцоўцы стадыёна Спартак у 2023 г.»*

**Торапава Алена Уладзіміраўна** – загадчыца кафедры гісторыі Расіі і археалогіі Наўгародскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Яраслава Мудрага, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Расійская Федэрацыя, Вялікі Ноўгарад); **Торапаў Сяргей Яўгенавіч** – дырэктар цэнтра археалагічных даследаванняў Наўгародскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Яраслава Мудрага (Расійская Федэрацыя, Вялікі Ноўгарад); **Грынёў Андрэй Міхайлавіч** – старшы выкладчык кафедры гісторыі Расіі і археалогіі Наўгародскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Яраслава Мудрага, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Расійская Федэрацыя, Вялікі Ноўгарад); **Самойлаў Кірыл Глебавіч** – навуковы супрацоўнік цэнтра археалагічных даследаванняў Наўгародскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Яраслава Мудрага (Расійская Федэрацыя, Вялікі Ноўгарад); **Сюбораў Валерый Юр'евіч** – навуковы супрацоўнік цэнтра археалагічных даследаванняў Наўгародскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Яраслава Мудрага (Расійская Федэрацыя, Вялікі Ноўгарад)

Тэма даклада: *«Полевые археологические исследования Центра археологических исследований кафедры истории России и археологии НовГУ в 2023 г.»*

**Мядзведзеў Аляксандр Міхайлавіч** – старшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Особенности материальной культуры железного века (по поводу концепции Л. Д. Поболя по керамике с расчесами)»*

**Курловіч Паліна Сяргееўна –** загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта БДУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Беларусь, Мінск); **Сахончык Алег Дзмітрыевіч** – старшы выкладчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта БДУ (Беларусь, Мінск); **Нікітка Анастасія Анатольеўна** – спецыяліст па забеспячэнні вучэбнага працэсу (Беларусь, Мінск); **Парамонава Дзіяна Сяргееўна** – аспірант Інстытута гісторыі НАН Беларусі (Беларусь, Мінск); **Панкевіч Глеб Дзмітрыевіч** – настаўнік гісторыі УА "Хутарская сярэдняя школа Чэрвеньскага раёна" (Беларусь, Чэрвень)

Тэма даклада: *«Даследаванні археалагічнага комплексу Рэчкі (Вілейскі раён) у 2023 г.»*

**Грыб Уладзімір Валер'явіч** – выкладчык УА «Мінскі дзяржаўны каледж будаўніцтва імя В. Г. Каменскага» (Беларусь, Мінск)*;* **Курловіч Паліна Сяргееўна –** загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта БДУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Методика топографической съёмки археологического комплекса у д. Речки с помощью тахеометра и Lidar (2021-2023 гг.)»*

**Граф Вадзім Ігаравіч –** малодшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«К вопросу об обуви с подошвенным швом (по материалам раскопок на Верхнем замке Полоцка (2021-2022 гг.) и на Верхнем замке Витебска (1978-1982 гг.))»*

**Калядзінскі Леанід Уладзіміравіч** – старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«О консервации участков застройки и артефактов из дерева XI – XIV вв. из городов Беларуси»*

**24 мая 2024 г.**
(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, пак. 223)
**Працяг пленарнага пасяджэння**
**09.30 – 13.00**

**Мадэратары**
***Дзярновіч Алег Іванавіч*** *– вядучы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі IX–XVIII стст. Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;* ***Вашанаў Аляксандр Мікалаевіч*** *– навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі*

**Язэпенка Ігар Мікалаевіч** – старшы навуковы супрацоўнік першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук (Беларусь, Мінск); **Вараненка Алег Васільевіч** – навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, магістр гістарычных навук (Беларусь, Мінск); **Яцін Павел Мікалаевіч** – аспірант Інстытута гісторыі НАН Беларусі (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці ў 2023 г.»*

**Вараненка Алег Васільевіч** – навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, магістр гістарычных навук (Беларусь, Мінск); **Язэпенка Ігар Мікалаевіч** – старшы навуковы супрацоўнік першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук (Беларусь, Мінск); **Ільіна Вікторыя Віктараўна** – навуковы супрацоўнік ДУК «Жлобінскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей» (Беларусь, Жлобін)

Тэма даклада: *«Археологические исследования в Гомельской и Могилёвской областях в 2023 г.»*

**Байкоўская Алена Арсенцьеўна –** навуковы супрацоўнік ДПУ «Нацыянальны парк «Прыпяцкі»» (Беларусь, аг. Ляскавічы)

Тэма даклада: *«Археологические исследования поселения Мордвин-2 в 2023 г.»*

**Башкоў Аляксандр Аляксандравіч** – дацэнт кафедры гісторыі славянскіх народаў БрДУ імя А.С. Пушкіна, доктар гістарычных навук, дацэнт (Беларусь, Мінск)

Доклад: «*Папярэднія вынікі археалагічных даследаванняў на Кобрынскім умацаванні Брэсцкай крэпасці ў 2024 г.»*

**Кенька Павел Міхайлавіч** – навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Исследования Гольшанского археологического комплекса в 2023 г.»*

**Дзярновіч Алег Іванавіч** – вядучы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі IX–XVIII стст. Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Беларусь, Мінск); **Ліхачоў Андрэй Станіслававіч** – старшыня дайвінг-цэнтра «Марскі-Пегас», лабарант рэспубліканскай лабараторыі гісторыка-культурнай спадчыны Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада*: «Гідраархеалагічныя даследаванні ў воз. Дзерба каля гарадзішча Маскавічы: прамежкавыя вынікі і даследчыя перспектывы»*

**Дрэвіла Вольга Алегаўна** – малодшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі, магістр гістарычных навук (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Археологические исследования городища-1 возле д. Лучин Рогачёвского района Гомельской области в 2023 г.»*

**Кенька Павел Міхайлавіч** – навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Исследование средневековых могильников в Ошмянском и Островецком районе Гродненской области в 2023 г.»*

**Дзярновіч Сяргей Дзмітрыевіч** – навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада*: «Археологические исследования (наблюдения) на территории западной окраины Верхнего города Минска в 2023 г.»*

**Калечыц Іна Леанідаўна** – Вядучы навуковы супрацоўнік цэнтра гісторыі навукі і архіўнай справы, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Новыя графіці Полацкай Спаса-Прэабражэнскай царквы»*

**Партноў Дзмітрый Валер'евіч** – малодшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Археологические исследования на территории Зельвенского, Мостовского и Сморгонского районов Гродненской области в 2023 г.»*

**Шаціла Аляксандр Сяргеевіч** – мастак аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны (Беларусь, Мінск); **Гоева Дарына Андрэеўна** – малодшы навуковы супрацоўнік аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Опыт реставрации археологической керамики из фондов Института истории: особенности, методика, результаты»*

**Дзярновіч Алег Іванавіч** – вядучы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі IX–XVIII стст. Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Архітэктурна-археалагічныя даследаванні ў Крэўскім замку ў сезоне 2023 г.: новыя пытанні і выклікі»*

**Ліндзянкоў Дзмітрый Мікалаевіч** – намеснік дырэктара музея па навуковай працы ДГКУ «Гомельскага палацава-паркавага ансамбля» (Беларусь, Гомель); **Іванова-Праля Кацярына Сяргееўна** – старшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі і аховы гісторыка-культурнай спадчыны ДГКУ «Гомельскага палацава-паркавага ансамбля» (Беларусь, Гомель)

Тэма даклада: *«Археологические исследования в историческом центре Гомеля в 2023 – начале 2024 гг.»*

**Юрэцкі Станіслаў Сцяпанавіч** – дырэктар Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: «*Археологические исследования на территории г. Лиды в 2023 г.*»

**Заранок Кацярына Аляксандраўна** – навуковы супрацоўнік УК «Жыліцкі гістарычны косплекс-музей» (Беларусь, Жылічы)

Тэма даклада: *«Результаты археологических разведок на территории Кировского района Могилевской области в 2023 г.»*

**Перапынак на абед**
**13.00 – 14.00**

**Працяг пленарнага пасяджэння**
**14.00 – 17.00**

**Мадэратары**

***Касцюкевіч Анастасія Уладзіміраўна** – загадчык аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук (Беларусь, Мінск); **Ліневіч Сяргей Барысавіч** – навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі*

**Пачобут Наталля Аляксандраўна** – старшы навуковы супрацоўнік аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны, кандыдат гістарычных навук (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Ахоўныя археалагічныя даследаванні ў г. Гродна ў 2024 г.»*

**Мяцельскі Андрэй Анатольевіч** – вядучы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі IX – XVIII стст. і археаграфіі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, дацэнт (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Археалагічныя даследаванні і перспектыва экспаніравання руін архітэктурных аб'ектаў Нясвіжа»*

**Касюк Алена Фёдараўна** – вядучы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі УК «Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей», кандыдат гістарычных навук (Беларусь, Гродна)

Доклад: *«Вынікі археалагічных разведак на тэрыторыі Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці і Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў 2023 годзе»*

**Няклюдава Таццяна Анатольеўна** – навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: «*Археологические исследования в историческом центре г. Бреста в 2023 г.»*

**Ляшкевіч Элона Аляксандраўна –** навуковы супрацоўнік аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны Інстытута гісторыі НАН Беларусі (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: «*Исследования городища Банцеровщина в 2023 г.»*

**Шаркоўская Наталля Юр'еўна** – вядучы навуковы супрацоўнік УК «Віцебскі абласны краязнаўчы музей» (Беларусь, Віцебск)

Тэма даклада: *«О работе в 2023 году по комплектованию и описанию коллекции археологии УК «ВОКМ» (новые поступления и результаты инвентаризации комплекса археологических материалов, переданных музею К. М. Поликарповичем в 1950-х гг.)»*

**Бубенька Таццяна Станіславаўна** – вядучы навуковы супрацоўнік НДС УА «Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П. М. Машэрава», кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Беларусь, Віцебск)

Тэма даклада: *«Исследование поселений в округе Витебска в 2020-2022 гг.(предварительные итоги)*»

**Гаршкоў Аляксандр Дзмітрыевіч** – старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы (Беларусь, Гродна)

Тэма даклада: «*Вынікі археалагічных даследаванняў на помніках Кавальцы 1 і Кавальцы 2 Гродзенскага раёна ў 2023 г.*»

**Касцюкевіч Анастасія Уладзіміраўна** – загадчык аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада*: «Новый опыт реставрации археологических находок из медных сплавов и мягких металлов»*

**Лашанкоў Міхаіл Іванавіч** – археолаг, кандыдат гістарычных навук (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Ботанические остатки на археологических памятниках Могилёвщины»*

**Спірын Іван Уладзіміравіч** – старшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Вынікі архелагічных даследванняў Віцебска і Оршы ў 2023 г.»*

**Цярэнцьеў Ігар Валер'явіч –** выкладчык кафедры археалогіі, гісторыі Беларусі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова (Беларусь, Магілёў)

Тэма даклада*: «Археологические разведки на территории Белыничского и Мстиславского районов Могилёвской области (аг. Техтин, д. Березетня)»*

**Федарук Дар'я Аляксандраўна** – малодшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі (Беларусь, Мінск)

Тэма даклада: *«Предварительные итоги археологических работ в исторической части г. Мозыря в 2022-2023 гг.»*

**Гаршкоў Аляксандр Дзмітрыевіч** – старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы (Беларусь, Гродна)

Тэма даклада: «*Папярэднія вынікі даследаванняў на помніку Зальвяны 2 (г. Масты) у 2023 г.*»

**Падвядзенне вынікаў работы і закрыццё канферэнцыі**
**17.00 – 17.30**

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова Нацыянальнай акадэміі
навук Беларусі
23.12.2016 № 9

# ІНСТРУКЦЫЯ
## аб парадку правядзення археалагічных даследаванняў і вядзення палявой дакументацыі пры іх правядзенні

## РАЗДЗЕЛ І
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак правядзення археалагічных даследаванняў і вядзення палявой дакументацыі пры іх правядзенні, у тым ліку асноўныя метады і методыку археалагічных даследаванняў археалагічных аб'ектаў, у тым ліку помнікаў археалогіі (далей – археалагічныя аб'екты), і археалагічных артэфактаў, прадстаўленне вынікаў археалагічных даследаванняў у выглядзе навуковай справаздачы аб выкананых археалагічных палявых работах (далей – навуковая справаздача), склад і структуру навуковай справаздачы, патрабаванні да яе афармлення і якасці.

2. У дадзенай Інструкцыі выкарыстоўваюцца тэрміны ў значэннях, вызначаных Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры, а таксама наступныя тэрміны:

выратавальныя (ахоўныя) археалагічныя даследаванні – мерапрыемствы па правядзенні археалагічных даследаванняў (візуальнае абследаванне тэрыторыі новабудоўлі, пошук, археалагічны нагляд, археалагічныя раскопкі) археалагічных аб'ектаў, якія знаходзяцца ў аварыйным стане ці ў зоне земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ, ажыццяўленні іншай дзейнасці на тэрыторыі археалагічных аб'ектаў;

дазвол на права правядзення археалагічных даследаванняў (далей – дазвол) – дакумент, які выдаецца Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі (далей – НАН Беларусі) ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку і з'яўляецца пацвярджэннем дадзенага права на правядзенне археалагічных даследаванняў;

навуковая справаздача – асноўны дакумент, які змяшчае вынікі археалагічных даследаванняў, праведзеных на падставе выдадзенага дазволу;

пашкоджаны культурны пласт (слой) – культурны пласт (слой), парушаны, разбураны ці пераадкладзены ў выніку прыродных працэсаў і тэхнагеннага ўмяшальніцтва, у тым ліку пасля засыпкі траншэй або будаўнічых катлаванаў раней адкапаным культурным слоем, а таксама ў выніку разворвання, размыву берагоў вадаёмаў і іншых падобных працэсаў;

палявая дакументацыя – дакументы, якія ствараюцца падчас археалагічных даследаванняў для дакладнага адлюстравання ўсіх этапаў навукова-даследчай археалагічнай палявой работы і складаюцца з палявога дзённіка; чарцяжоў; планаў раскопаў, шурфаў, пластоў, курганоў, пахаванняў, ям, пабудоў, архітэктурных рэштак і іншых археалагічных аб'ектаў; планаў размяшчэння археалагічных артэфактаў; планаў нівеліроўкі дзённай паверхні, археалагічных аб'ектаў і мацерыка; альбома

малюнкаў; стратыграфічных профіляў раскопаў і археалагічных аб’ектаў; палявых вопісаў;

палявы дзённік – першасная палявая дакументацыя, якая штодзённа вядзецца падчас археалагічных палявых работ;

прафесійныя веды – комплекс навукова-практычных і тэарэтычных ведаў, якія неабходны для правядзення археалагічных даследаванняў і падрыхтоўкі навуковай справаздачы аб выкананых археалагічных палявых работах;

трымальнік дазволу або даследчык – фізічная асоба, якая атрымала дазвол у адпаведнасці з заканадаўствам аб адміністрацыйных працэдурах па заяве навуковай арганізацыі або музея, у якой фізічная асоба працуе на ўмовах працоўнага дагавора (кантракта) або ажыццяўляе дзейнасць на падставе грамадзянска-прававога дагавора.

3. Дадзеная Інструкцыя распаўсюджваецца на ўсіх юрыдычных і фізічных асоб, якія праводзяць археалагічныя даследаванні ў адпаведнасці з заканадаўствам.

## РАЗДЗЕЛ II
## ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

### ГЛАВА 1
### АГУЛЬНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ПРАВЯДЗЕННЯ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

4. Археалагічныя даследаванні могуць праводзіцца на падставе дазволаў, выдадзеных па формах № 1–4 у адпаведнасці з Палажэннем аб парадку выдачы дазволу на права правядзення археалагічных даследаванняў, прыпынення, спынення яго дзеяння, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 5 сакавіка 2016 г. № 185 (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 12.03.2016, 5/41785) (далей – дазволы формаў № 1–4).

5. Выкананне археалагічных раскопак, археалагічных разведак і пошуку ў канкрэтных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках ажыццяўляецца на падставе дазволу формы № 1.

Выкананне археалагічных разведак і пошуку ў канкрэтных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках, абмежаваных археалагічных раскопак канкрэтных паселішчаў і грунтовых могільнікаў (участкаў да 24 кв. метраў) ажыццяўляецца на падставе дазволу формы № 2.

Выкананне археалагічных разведак і пошуку без земляных работ у канкрэтных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках ажыццяўляецца на падставе дазволу формы № 3.

Выкананне выратавальных (ахоўных) археалагічных даследаванняў ажыццяўляецца на падставе дазволу формы № 4.

Выкарыстанне металашукальнікаў, геарадараў і іншых тэхнічных сродкаў і інструментаў для абследавання паверхні зямлі і (або) дна прыродных і штучных вадаёмаў дапускаецца на падставе дазволаў формаў № 1, 2 і 4.

6. Археалагічныя даследаванні пачынаюцца пасля таго, як навуковыя арганізацыі або музеі, якія атрымалі дазвол на імя фізічнай асобы, перад пачаткам археалагічных работ у пісьмовай форме інфармуюць органы мясцовай выканаўчай улады аб месцы і тэрмінах правядзення археалагічных даследаванняў з прыкладаннем копіі дазволу.

7. Трымальнік дазволу:

непасрэдна кіруе археалагічнымі даследаваннямі, вызначанымі дазволам, на працягу ўсяго тэрміну работ;

вядзе палявую дакументацыю, у тым ліку афармляе ў адпаведнасці з патрабаваннямі дадзенай Інструкцыі навуковую справаздачу для прадстаўлення яе ў дзяржаўную навуковую ўстанову «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (яе структурнае падраздзяленне) не пазней 30 красавіка наступнага года пасля тэрміну дзеяння дазволаў;

прысутнічае падчас выратавальных (ахоўных) археалагічных даследаванняў, якія выконваюцца на падставе дазволу формы № 4, а таксама падчас ажыццяўлення земляных і будаўнічых работ, іншай дзейнасці на тэрыторыі археалагічнага аб’екта па неабходнасці;

забяспечвае захаванне даследуемых археалагічных аб’ектаў і археалагічных артэфактаў, спрыяе іх захаванасці пасля завяршэння даследаванняў;

пры выяўленні археалагічнага аб’екта і (або) археалагічнага артэфакта выконвае абавязкі, прадугледжаныя артыкулам 87 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры.

8. Падчас археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь прыярытэтным з’яўляецца комплексны падыход да вывучэння археалагічных аб’ектаў і археалагічных артэфактаў з прыцягненнем спецыялістаў сумежных прыродазнаўчых навук (антраполагаў, геафізікаў, глебазнаўцаў, геолагаў, геамарфолагаў, палеабатанікаў, палеазаолагаў) і выкарыстаннем спецыяльных метадаў даследаванняў.

9. Выкарыстанне металашукальнікаў, геарадараў і іншых тэхнічных сродкаў і інструментаў падчас археалагічных даследаванняў не з’яўляецца самастойным метадам і дапускаецца толькі сумесна з іншымі метадамі даследаванняў на падставе выдадзенага дазволу.

10. Археалагічныя даследаванні (археалагічныя разведкі, археалагічныя раскопкі) не дапускаецца праводзіць пры наяўнасці снегавога покрыва і тэмпературы грунту ніжэй за 0 °С. Для ажыццяўлення археалагічных раскопак, у тым ліку выратавальных (ахоўных), у зімовы перыяд неабходна ўладкаванне над раскопам павільёна для забеспячэння аптымальнага тэмпературнага рэжыму (не ніжэй за 5 °С), а таксама асвятлення, дастатковага для графічнай і фотафіксацыі.

## ГЛАВА 2
## ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ АРХЕАЛАГІЧНАЙ РАЗВЕДКІ

11. Перад пачаткам археалагічнай разведкі трымальнік дазволу знаёміцца з літаратурнымі і архіўнымі матэрыяламі, якія маюць дачыненне да археалагічных аб’ектаў і адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, на якіх будуць праводзіцца

археалагічныя даследаванні, а таксама рыхтуе спадарожнікавыя здымкі мясцовасці з маштабам і тапаграфічныя карты для фіксацыі на іх адкрытых і абследаваных археалагічных аб'ектаў.

12. Падчас археалагічнай разведкі трымальнік дазволу:

пазначае на картаграфічным матэрыяле, у тым ліку на спадарожнікавых здымках, з пазначэннем маштабу ўсе абследаваныя і ўпершыню адкрытыя археалагічныя аб'екты, а таксама праводзіць іх GPS-фіксацыю;

складае сітуацыйны план археалагічнага аб'екта (у маштабе не менш за 1:2000) з абазначэннем гарызанталямі рэльефу і дакладнай прывязкай да арыенціраў, а таксама абазначае на ім пры магчымасці з дапамогай GPS-фіксацыі ўсе шурфы, зачысткі, канцэнтрацыі артэфактаў, месцы пашкоджання культурнага пласта (слоя), у тым ліку кар'еры, ямы, западзіны;

праводзіць збор археалагічных артэфактаў і складае іх вопіс;

праводзіць поўную і дакладную фотафіксацыю археалагічнага аб'екта з адлюстраваннем асаблівасцей рэльефу і тапаграфічнай сітуацыі;

збірае інфармацыю для поўнай характарыстыкі археалагічнага аб'екта: аб геаграфічным становішчы, тапаграфіі, суадносінах з суседнімі вадаёмамі і населенымі пунктамі, форме і памерах, тэрыторыі распаўсюджання археалагічных артэфактаў, магутнасці і насычанасці культурнага пласта (слоя), наяўнасці на плошчы пабудоў, дрэў, ям, пашкоджанняў, стане захаванасці і выкарыстання ў гаспадарчых мэтах;

пры выяўленні выяў або надпісаў на камянях робіць дакладнае апісанне камянёў, выяў або надпісаў, іх лакалізацыі, метрычных параметраў, ажыццяўляе графічную і фотафіксацыю найбольш характэрных асаблівасцей з маштабам і пазначэннем напрамку свету. Не дапускаецца абмяжоўвацца рэгістрацыяй і апісаннем найбольш эфектных фігур і кампазіцый.

Пры капіраванні выяў або надпісаў на камянях, іх графічнай і фотафіксацыі не дапускаецца выкарыстоўванне сродкаў, якія наносяць шкоду захаванасці выяў або надпісаў.

13. Трымальнік дазволаў формаў № 1, 2 і 4 з мэтай вызначэння магутнасці, плошчы пашырэння і характару культурнага пласта (слоя) археалагічнага аб'екта мае права правесці на ім земляныя работы ў выглядзе зачысткі агаленняў і закладкі шурфаў.

14. Для аднаго археалагічнага аб'екта агульная плошча шурфаў не павінна перавышаць 24 кв. метры. Памеры шурфаў вызначаюцца мэтамі археалагічнага даследавання, характарам археалагічнага аб'екта і не павінны мець плошчу менш за 1 кв. метр.

15. Падчас археалагічнай разведкі неабходна імкнуцца да мінімальнага разбурэння культурнага пласта (слоя) археалагічнага аб'екта, у тым ліку пазбягаць закладкі вялікай колькасці шурфаў і абмяжоўвацца зачысткамі агаленняў. У выпадку выяўлення ў культурным пласце (слоі) археалагічнага аб'екта, які разбураецца пад уздзеяннем прыродных або тэхнагенных з'яў, яго па магчымасці неабходна даследаваць цалкам.

16. Праводзіць шурфоўку на раней даследаваных археалагічнымі раскопкамі помніках археалогіі дапускаецца ў выключных выпадках і з абгрунтаваннем мэтазгоднасці археалагічных земляных работ.

17. Закладка разведачных шурфаў дапускаецца толькі на выяўленых паселішчах, гарадзішчах і ў месцах верагодных грунтовых могільнікаў. Шурфоўка кurganoў, абарончых збудаванняў ці іншых бачных археалагічных канструкцый, западзін ад жытлаў не дапускаецца.

18. Пры выяўленні ў шурфах рэшткаў жытлаў і другіх старажытных пабудоў не дапускаецца парушаць іх комплекснасць. Шурфоўку на гэтым месцы неабходна прыпыніць, рэшткі пабудовы закансерваваць, шурф засыпаць.

19. Пры выяўленні ў шурфе часткі старажытнага пахавання неабходна павялічыць памеры шурфа і даследаваць пахаванне цалкам.

20. Пры фатаграфаванні агульнага выгляду шурфаў і профіляў іх сценак павінна выкарыстоўвацца маштабная рэйка і паказальнік напрамку свету.

21. Планы і стратыграфічныя профілі ўсіх шурфаў складаюцца незалежна ад наяўнасці ці адсутнасці ў іх культурнага пласта (слоя). Асаблівасці стратыграфіі павінны быць дакладна апісаны ў палявым дзённіку і прадстаўлены ў графічным і фатаграфічным выглядзе ў навуковай справаздачы.

22. Пасля завяршэння земляных работ усе шурфы павінны быць засыпаны, што адлюстроўваецца на фотаздымках.

23. Выкарыстанне металашукальнікаў, георадараў і іншых тэхнічных сродкаў і інструментаў падчас археалагічнай разведкі для пошуку і збору археалагічных артэфактаў дапускаецца ў наступных выпадках:

з GPS-фіксацыяй месцазнаходжанняў археалагічных знаходак на сітуацыйным плане археалагічнага аб’екта ў маштабе не менш за 1:200 або спадарожнікавым здымку мясцовасці з пазначэннем яго маштабу;

на ўчастках археалагічных аб’ектаў, якія разбураюцца (ворыва, агаленні, выкапаныя кар’еры, скарбашукальніцкія шурфы, ямы), на глыбіню пашкоджанага культурнага слоя;

для абследавання тэрыторыі археалагічных аб’ектаў без выемкі археалагічных артэфактаў перад пачаткам археалагічных раскопак;

для праверкі перагледжанага культурнага пласта (слоя) падчас шурфоўкі (адвалаў) археалагічных аб’ектаў і тэрыторыі пасля засыпкі шурфаў.

24. Падводная археалагічная разведка (разведка акваторыі) ажыццяўляецца дыстанцыйным і візуальным метадамі даследавання з фіксацыяй пошукавых маршрутаў, выяўленых анамалій, скапленняў археалагічных артэфактаў і археалагічных аб’ектаў з дапамогай сродкаў GPS-фіксацыі і нанясеннем іх на агульны план акваторыі. Выяўленыя анамаліі, скапленні артэфактаў, археалагічныя аб’екты вывучаюцца візуальна або з дапамогай шурфоўкі.

25. Падводная археалагічная шурфоўка можа ажыццяўляцца з прымяненнем спецыяльнай тэхнікі пасля прывязкі і фіксацыі межаў шурфа да адзінай каардынацыйнай сеткі. Пры падводных работах павінна ажыццяўляцца дакладная графічная і фотафіксацыя.

26. Пры папярэднім абследаванні затопленых суднаў і іх рэшткаў, рэшткаў драўлянай забудовы і канструкцый дапускаецца адбор узораў для дэндрахраналагічнага аналізу (і іншых аналізаў) і збор археалагічных артэфактаў, якія неабходны для іх ідэнтыфікацыі і датавання.

27. Выемка арганічных і металічных археалагічных артэфактаў, а таксама рэшткаў канструкцый са стабільнага асяроддзя пад вадой павінна быць суаднесена з далейшай магчымасцю іх першапачатковай стабілізацыі і кансервацыі.

## ГЛАВА 3
## ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ АРХЕАЛАГІЧНЫХ РАСКОПАК

28. Для правядзення археалагічных раскопак выбіраюцца археалагічныя аб'екты, на якіх могуць быць атрыманы найбольш значныя вынікі, неабходныя для распрацоўкі фундаментальных навуковых тэм у археалогіі і гісторыі Беларусі і Еўропы.

29. Перад пачаткам археалагічных раскопак трымальнік дазволу павінен азнаёміцца з літаратурнымі і архіўнымі матэрыяламі, якія характарызуюць аб'ект раскопак, а таксама падрыхтаваць спадарожнікавыя здымкі і сітуацыйны план (пры наяўнасці) археалагічнага аб'екта.

30. Да пачатку стацыянарных раскопак ажыццяўляецца дадатковае абследаванне археалагічнага аб'екта і яго наваколля, складаецца сітуацыйны план (пры неабходнасці), праводзіцца яго ўсебаковая фотафіксацыя.

31. Выбар месца для закладкі раскопу і памеры раскопу вызначаюцца мэтамі даследавання археалагічнага аб'екта, тэхнічнымі і арганізацыйнымі магчымасцямі археалагічнай экспедыцыі і іншымі фактарамі. Павінна ўлічвацца таксама ступень захаванасці археалагічнага аб'екта. Першачарговае даследаванне праводзіцца на тых участках, якім пагражае разбурэнне ў выніку прыродных працэсаў і гаспадарчай дзейнасці.

32. На адным археалагічным аб'екце павінна закладвацца мінімальная колькасць раскопаў. Павелічэнне колькасці раскопаў дапускаецца шляхам прырэзак да існуючых раскопаў. Не дапускаецца пакідаць паміж раскопамі невялікія ўчасткі недаследаванага культурнага пласта (слоя).

33. Пры неабходнасці закладкі некалькіх раскопаў на розных участках археалагічнага аб'екта яны павінны размяшчацца ў адзінай каардынацыйнай сетцы, падрыхтаванай для ўсяго археалагічнага аб'екта, а таксама мець прывязку да адзінага стацыянарнага рэпера, ад якога робіцца нівеліроўка ўсіх раскопаў. Пры гэтым можа выкарыстоўвацца прывязка да балтыйскай сістэмы вышынь.

34. Археалагічныя раскопкі паселішчаў і грунтовых могільнікаў павінны ажыццяўляцца вялікімі раскопамі, якія дазваляюць атрымаць матэрыялы для якаснай навуковай культурна-храналагічнай характарыстыкі археалагічнага аб'екта.

Археалагічныя раскопкі паселішчаў і грунтовых могільнікаў толькі з дапамогай шурфаў не дапускаюцца.

35. Асобныя гаспадарчыя аб'екты, западзіны ад жытлаў, пляцоўкі жылых і гаспадарчых пабудоў, абарончыя збудаванні ці іншыя бачныя археалагічныя канструкцыі

павінны ўваходзіць у межы агульнага раскопу, які ахоплівае і плошчу паміж даследуемымі археалагічнымі аб'ектамі.

36. Раскопы на паселішчах усіх відаў (стаянкі, селішчы, гарадзішчы), у тым ліку затопленых, павінны быць падзелены на квадраты, памер якіх у залежнасці ад абранай методыкі складае 1 x 1, 2 x 2, 5 x 5 метраў.

Усе квадраты раскопу нівеліруюцца ад аднаго стацыянарнага рэпера.

37. Пры археалагічных раскопках паселішчаў з культурным пластом (слоем) высокай вільготнасці, у тым ліку пры высокім узроўні грунтовых вод і прыродных анамаліях, павінны ажыццяўляцца мерапрыемствы, якія забяспечваюць магчымасць паўнавартаснага вывучэння, фіксацыі культурнага пласта (слоя) і канструкцый да мацерыка. Дапускаецца закладка невялікіх дрэнажных калодзежаў, ручная або механізаваная выбарка вады, «прыступкавы» або «шахматны» спосаб даследавання культурнага пласта (слоя) для збору вады ў заглыбленых квадратах. У выпадку неабходнасці дапускаецца выкарыстанне апалубкі, якая ўтрымлівае сценкі раскопу ад разбурэння.

38. Археалагічныя раскопкі курганоў праводзяцца па сектарах або з захаваннем дзвюх узаемна перпендыкулярных бровак. Дапускаецца вывучэнне некалькіх курганоў вялікімі раскопамі з разбіўкай іх на квадраты, якія ахопліваюць насыпы, ровікі і прылеглую тэрыторыю паміж курганамі.

39. Археалагічныя раскопкі грунтовых і курганных могільнікаў з мала прыкметнымі і (або) узаемна перакрываючымі адзін аднаго насыпамі павінны праводзіцца вялікімі раскопамі з разбіўкай іх на квадраты і захаваннем бровак на найбольш выразных участках рэльефу. Броўкі разбіраюцца пасля іх апісання, графічнай і фотафіксацыі.

40. Падчас археалагічных раскопак грунтовых і курганных могільнікаў (насыпаў курганоў) павінна быць забяспечана выяўленне і фіксацыя ўсіх археалагічных артэфактаў і археалагічных аб'ектаў, у тым ліку ўпускных пахаванняў, канструкцый і складу насыпу, узроўню пахаванняў, пахаванай глебы і мацерыка, наяўнасці падсыпак, рэштак іншых збудаванняў унутры насыпу, пад ім або вакол яго, рэштках трызны.

41. Выкарыстанне металашукальнікаў, геарадараў і іншых тэхнічных сродкаў і інструментаў падчас археалагічных раскопак курганных і грунтовых пахаванняў, а таксама розных відаў паселішчаў дапускаецца ў наступных выпадках:

для папярэдняга абследавання з мэтай вызначэння наяўнасці металічных археалагічных артэфактаў без іх выемкі;

на ўчастках, якія разбураюцца (ворыва, агаленні, кар'еры, скарбашукальніцкія шурфы, ямы), для збору археалагічных артэфактаў у выкінутым грунце з графічнай і фотафіксацыяй ходу работ;

для праверкі перагледжанага культурнага пласта (слоя) падчас археалагічных раскопак (адвалаў) і тэрыторыі пасля засыпкі раскопу.

Усе выяўленыя з дапамогай металашукальнікаў археалагічныя артэфакты (у тым ліку археалагічныя артэфакты з адвалаў) павінны быць уключаны ў палявы вопіс і

апісаны ў навуковай справаздачы з адпаведнымі тлумачэннямі аб умовах выяўлення.

42. Не дапускаецца выкарыстанне металашукальнікаў для збору і выемкі інвентару пахаванняў без поўнай расчысткі і даследавання пахавальнага комплексу.

43. Археалагічныя раскопкі розных відаў паселішчаў (стаянак, селішчаў, гарадзішчаў), у тым ліку шматслойных і затопленых, праводзяцца паквадратна і паслойна з дакладнай фіксацыяй і апісаннем усіх:

асаблівасцей кожнага знятага слоя і паселішча ў цэлым;

выяўленых асобных культурных пластоў (слаёў);

стэрыльных праслоек;

археалагічных аб’ектаў;

археалагічных артэфактаў, іх размяшчэння на плошчы раскопу (планіграфіі), а таксама суадносін са слаямі і пабудовамі.

Магутнасць кожнага асобнага слоя ў раскопе залежыць ад віду археалагічнага аб’екта і не павінна перавышаць 0,1–0,2 метра.

44. Археалагічныя раскопкі культурнага пласта (слоя) на археалагічных аб’ектах праводзяцца ручным інструментам. Дапускаецца выкарыстанне землярыйных машын і механізмаў:

для баластавых (падрыхтоўчых) работ, у тым ліку зняцця перакрываючага

стэрыльнага слоя (грунту), пагрузкі і транспарціроўкі перабранага грунту;

на палях бітваў, пераправах і тэрыторыі ваенных лагераў пры ўмове значнай пашкоджанасці або адсутнасці культурнага пласта (слоя).

Зняцце грунту землярыйнымі машынамі ці механізмамі павінна ажыццяўляцца тонкімі (не болей за 0,1 метра) пластамі з пастаянным кантролем даследчыка і далейшай расчысткай і выемкай выяўленых археалагічных аб’ектаў і археалагічных артэфактаў ручнымі інструментамі.

45. Археалагічныя раскопкі культурнага пласта (слоя) на археалагічных аб’ектах праводзяцца да мацерыка, калі гэтаму не перашкаджаюць знойдзеныя будаўнічыя і архітэктурныя рэшткі, якія патрэбна захаваць.

46. Пасля зачысткі паверхні мацерыка ажыццяўляецца кантрольны перакоп мацерыка на ўсёй плошчы раскопу на глыбіню да 0,2 метра.

47. Культурны пласт (слой) з высокай канцэнтрацыяй дробных артэфактаў прамываецца (флатацыя) або прасейваецца праз дробнаячэістую металічную сетку з паквадратнай і паслойнай фіксацыяй археалагічных артэфактаў.

48. Археалагічныя раскопкі археалагічных аб’ектаў, на якіх прысутнічаюць архітэктурныя канструкцыі, праводзяцца да іх поўнага выяўлення і фіксацыі без выемкі і разбурэння. У выпадку правядзення сістэматычных шматгадовых археалагічных раскопак на адным археалагічным аб’екце з захаваннем знойдзеных архітэктурных канструкцый у адкрытым выглядзе павінны быць прыняты меры для іх кансервацыі і аховы.

49. Падчас раскопак археалагічных аб’ектаў усіх тыпаў павінна праводзіцца нівеліроўка дзённай і мацерыковай паверхні (раскопу, кургана) ад адзінага нулявога рэпера, а таксама ўсіх слаёў і аб’ектаў, у тым ліку пабудоў, узроўняў падлогі,

прапласткаў, вогнішчаў, пахаванняў, рэшткаў трызны, важных археалагічных артэфактаў.

50. Падчас археалагічных раскопак павінна праводзіцца фотафіксацыя ўсіх этапаў працэсу археалагічных даследаванняў і ўсіх выяўленых археалагічных аб’ектаў. Пры фотафіксацыі пазначаюцца напрамкі свету, выкарыстоўваюцца маштабная рэйка, лінейка, дзяленні якой павінны праглядацца на фотаздымку. Вынікі фотафіксацыі прадстаўляюцца ў навуковай справаздачы.

51. Выяўленыя падчас археалагічных раскопак археалагічныя артэфакты, у тым ліку фрагментаваныя і часткова пашкоджаныя, бяруцца для правядзення камеральных работ.

Камеральным работам падлягаюць:

інвентар пахавальных комплексаў;

матэрыялы закрытых комплексаў (пабудоў);

цэлыя ці складаныя рэчы;

індывідуальныя знаходкі;

нумізматычныя і эпіграфічныя знаходкі;

знаходкі, якія маюць мастацкае значэнне;

знаходкі, па якіх можна датаваць раскоп, пласт і г.д.;

знаходкі, якія паказваюць культурную прыналежнасць археалагічнага аб’екта, яго гаспадарчую характарыстыку і г.д.;

невядомыя да гэтага рэчы;

знаходкі з помнікаў каменнага і бронзавага вякоў;

астэалагічны матэрыял.

Пазначаныя археалагічныя артэфакты павінны быць занесены ў палявы вопіс і мець пашпартныя дадзеныя з указаннем дакладнага месцазнаходжання кожнай рэчы ці фрагмента (назва археалагічнага аб’екта, нумарацыя раскопу, квадрата, пласта, аб’екта, а таксама глыбіня залягання).

Чалавечыя касцявыя парэшткі павінны вызначацца антраполагамі, пасля чаго яны могуць быць уключаны ў склад калекцыі або перапахаваны.

Дапускаецца адбор для астэалагічнага вызначэння матэрыялу з непашкоджаных стратыфікаваных культурных напластаванняў і закрытых комплексаў.

Адбор астэалагічных, палеабатанічных, антрапалагічных знаходак і рэшткаў металургічнай вытворчасці праводзіцца з удзелам спецыялістаў. Пры адсутнасці спецыялістаў забіраюцца ўсе знаходкі.

52. У залежнасці ад ступені вывучанасці і захаванасці археалагічнага аб’екта дапускаецца пакіданне часткі знаходак (дробныя сценкі ганчарнай керамікі, фрагментаваныя косткі жывёл са стратай вызначальных кампанентаў) на месцы археалагічных палявых работ.

Пакінутыя ў раскопе археалагічныя артэфакты павінны быць падлічаны, зафатаграфаваны, апісаны, падрабязна зафіксаваны ў палявым дзённіку і адлюстраваны ў навуковай справаздачы з пазначэннем дакладнага месца захавання на плане раскопу.

53. Пасля завяршэння археалагічных раскопак усе раскопы засыпаюцца, узнаўляюцца насыпы курганоў і абарончых збудаванняў, прыбіраюцца выкіды глебы, аднаўляецца ландшафт, які існаваў да пачатку раскопак.

Пасля археалагічных раскопак каменных могільнікаў, могільнікаў з каменнымі крыжамі, культавых камянёў, каменных выкладак яны ўзнаўляюцца ў блізкім да першапачатковага стане.

Вынікі фотафіксацыі ўзноўленых пасля археалагічных раскопак археалагічных аб'ектаў прадстаўляюцца ў навуковай справаздачы.

54. Не завершаныя па аб'ектыўных прычынах раскопы, у тым ліку недаследаваныя археалагічныя аб'екты ў іх, кансервуюцца, што фіксуецца на фотаздымках і прадстаўляецца ў навуковай справаздачы.

55. Пры стацыянарных работах на палях бітваў, пераправах і месцах ваенных лагераў дапускаецца прымяненне металашукальнікаў з суцэльнай выбаркай археалагічных артэфактаў з іх GPS-фіксацыяй, а таксама пазначэннем на тапаграфічным плане з каардынатнай сеткай не меней за 1:200. Адзначаюцца ўмовы і глыбіні выяўлення археалагічных артэфактаў, што адлюстроўваецца ў навуковай справаздачы.

56. Перад пачаткам суцэльнай выбаркі археалагічных артэфактаў распрацоўваюцца два шурфы плошчай не менш за 4 кв. метры ў розных месцах археалагічнага аб'екта для фіксацыі наяўнасці (адсутнасці) культурнага пласта (слоя).

57. Падводныя археалагічныя раскопкі могуць ажыццяўляцца з прымяненнем спецыяльнай тэхнікі, у тым ліку помпы для размыўкі грунту, пасля прывязкі і фіксацыі межаў раскопаў да адзінай каардынацыйнай сеткі, якая ахоплівае даследуемы археалагічны аб'ект і прылеглы да яго ўчастак дна. Пры падводных работах павінна ажыццяўляцца дакладная графічная і фотафіксацыя, а таксама відэафіксацыя ходу і вынікаў работ. Выкарыстоўваюцца метады вымярэння, якія адаптаваны да ўмоў акваторыі.

Выемка арганічных і металічных археалагічных артэфактаў, а таксама рэшткаў канструкцый са стабільнага асяроддзя пад вадой павінна быць суаднесена з далейшай магчымасцю іх першапачатковай стабілізацыі і кансервацыі.

## ГЛАВА 4
## ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ ВЫРАТАВАЛЬНЫХ (АХОЎНЫХ) АРХЕАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

58. Выратавальныя (ахоўныя) археалагічныя даследаванні праводзяцца на археалагічных аб'ектах, якія знаходзяцца ў аварыйным стане ці ў зоне земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ, ажыццяўлення іншай дзейнасці на тэрыторыі археалагічных аб'ектаў.

59. Правядзенне выратавальных (ахоўных) археалагічных даследаванняў ажыццяўляецца на падставе дазволу формы № 4 шляхам візуальнага абследавання тэрыторыі новабудоўлі, пошуку, археалагічнага нагляду, археалагічных раскопак.

60. Перад правядзеннем выратавальных (ахоўных) археалагічных даследаванняў, у тым ліку археалагічнага нагляду, неабходна азнаёміцца з архіўнымі, літаратурнымі, іншымі крыніцамі і матэрыяламі, якія характарызуюць даследуемы

археалагічны аб’ект і тэрыторыю земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ, ажыццяўлення іншай дзейнасці на тэрыторыі археалагічных аб’ектаў.

61. Правядзенне выратавальных (ахоўных) археалагічных даследаванняў у выглядзе візуальнага абследавання тэрыторыі новабудоўлі, пошуку і археалагічных раскопак ажыццяўляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі глаў 2 і 3 дадзенай Інструкцыі, калі іншае не прадугледжана дадзенай главой.

62. На археалагічных аб’ектах, якія знаходзяцца ў зоне земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ, ажыццяўлення іншай дзейнасці, выратавальныя (ахоўныя) археалагічныя даследаванні ажыццяўляюцца з улікам патрабаванняў артыкулаў 129 и 130 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры.

63. Выратавальныя (ахоўныя) археалагічныя даследаванні ў зоне земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ, ажыццяўлення іншай дзейнасці на тэрыторыі археалагічных аб’ектаў праводзяцца трымальнікам дазволу на падставе дагавора НАН Беларусі з юрыдычнымі і фізічнымі асобамі, у тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія забяспечваюць распрацоўку і фінансаванне мер па ахове археалагічных аб’ектаў пры выкананні работ у названых зонах і з’яўляюцца заказчыкамі гэтых работ.

Меры па ахове археалагічных аб’ектаў уключаюцца ў праектную дакументацыю на выкананне работ на тэрыторыі археалагічных аб’ектаў.

Парадак рэалізацыі мер па ахове археалагічных аб’ектаў пры выкананні работ на тэрыторыі археалагічных аб’ектаў распрацоўваецца навуковымі арганізацыямі і музеямі, якім выдадзены дазвол на права правядзення археалагічных даследаванняў.

64. Для распрацоўкі мер па ахове археалагічных аб’ектаў у зоне земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ, ажыццяўлення іншай дзейнасці на тэрыторыі археалагічных аб’ектаў трымальнік дазволу праводзіць:

фіксацыю вядомых археалагічных аб’ектаў на праектным матэрыяле;

абследаванне зоны земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ,

ажыццяўлення іншай дзейнасці на тэрыторыі археалагічных аб’ектаў з мэтай выяўлення

няўлічаных археалагічных аб’ектаў, у тым ліку іх фіксацыю, і пры неабходнасці археалагічныя даследаванні (археалагічныя раскопкі, археалагічны нагляд).

Пры распрацоўцы мер па ахове археалагічных аб’ектаў у зоне земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ павінны ўлічвацца кліматычныя ўмовы. У перыяд наяўнасці снегавога покрыва і тэмпературы грунту ніжэй за 0 °С неабходна прадугледжваць уладкаванне павільёна над даследуемым участкам для забеспячэння аптымальнага тэмпературнага рэжыму (не ніжэй за 5 °С), а таксама асвятлення, дастатковага для графічнай і фотафіксацыі.

65. Пры правядзенні археалагічных раскопак на археалагічных аб’ектах, якія знаходзяцца ў зоне земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ, ажыццяўлення іншай дзейнасці, дапускаецца ў выпадку навуковай неабходнасці зрабіць прырэзку да раскопу па-за межамі ўчастка такіх работ.

Пры немагчымасці правядзення археалагічных раскопак на тэрыторыі археалагічных аб’ектаў, якія трапілі ў зону земляных, будаўнічых, меліярацыйных і

іншых работ, ажыццяўляецца археалагічны нагляд, які вядзецца адначасова з гэтымі работамі, у тым ліку на працягу ўсяго каляндарнага года.

66. Археалагічны нагляд праводзіцца на ўсёй тэрыторыі земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ, ажыццяўлення іншай дзейнасці на тэрыторыі археалагічных аб’ектаў, якія закранаюць археалагічны аб’ект, у адпаведнасці з праектнай дакументацыяй на выкананне дадзеных работ. Як правіла, археалагічны нагляд не праводзіцца ў месцах добраўпарадкавання тэрыторыі без парушэння культурнага пласта (слоя) і перакладкі інжынерных камунікацый па старым напрамку.

67. Падчас археалагічнага нагляду праводзяцца гарызантальныя і вертыкальныя зачысткі ў будаўнічых катлаванах і траншэях, фіксацыя і вывучэнне ўсіх выяўленых археалагічных аб’ектаў, выемка археалагічных артэфактаў у поўным аб’ёме, апісанне асаблівасцей культурнага пласта (слоя) і выяўленых археалагічных артэфактаў і археалагічных аб’ектаў, што адлюстроўваецца ў палявой дакументацыі і навуковай справаздачы.

Праводзіцца фотафіксацыя ўсіх этапаў земляных работ, графічная фіксацыя профіляў будаўнічых катлаванаў і траншэй, археалагічных аб’ектаў і канструкцый у маштабе не менш за 1:40 у месцах наяўнасці культурных напластаванняў, нівеліроўка і абмеры рэшткаў выяўленых археалагічных аб’ектаў, у тым ліку абарончых, культавых, грамадскіх, жыллёвых, прамысловых і гаспадарчых пабудоў, будаўнічага матэрыялу.

Пры давядзенні будаўнічых катлаванаў і траншэй да ўзроўню мацерыка даецца яго апісанне з улікам заглыблення ў мацярык існуючых археалагічных аб’ектаў, пабудоў і канструкцый.

У выпадку перавышэння магутнасці культурнага пласта (слоя) глыбіні будаўнічых катлаванаў яго фіксацыя праводзіцца ў межах глыбіні земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ. У такім выпадку, як правіла, праводзіцца кантрольная шурфоўка асобных участкаў з паслойнай фіксацыяй стратыграфіі да мацерыка.

68. Падчас археалагічнага нагляду праводзіцца пераборка культурнага пласта (слоя), які выкінуты з будаўнічых катлаванаў і траншэй, выемка археалагічных артэфактаў са дна і сценак катлаванаў і траншэй з фіксацыяй асаблівасцей культурнага пласта (слоя), месца і ўмоў выяўлення артэфакта.

69. Пры правядзенні археалагічнага нагляду, як правіла, павінен выкарыстоўвацца металашукальнік з мэтай больш поўнага збору археалагічных артэфактаў, якія фіксуюцца на тапаграфічным плане і плане археалагічнага аб’екта з пазначэннем умоў і глыбіні іх выяўлення.

Металашукальнікам павінны абследавацца выкіды і адвалы грунту, дно катлаванаў і траншэй.

70. Пры выяўленні на тэрыторыі земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ, ажыццяўленні іншай дзейнасці, у тым ліку на ўчастках будаўнічых катлаванаў і траншэй, непашкоджанага культурнага пласта (слоя), археалагічных аб’ектаў і архітэктурных канструкцый, такія работы прыпыняюцца і праводзяцца выратавальныя (ахоўныя) археалагічныя раскопкі.

## РАЗДЗЕЛ III
## ПАРАДАК ВЯДЗЕННЯ ПАЛЯВОЙ ДАКУМЕНТАЦЫІ
### ГЛАВА 5
### АГУЛЬНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЯДЗЕННЯ ПАЛЯВОЙ ДАКУМЕНТАЦЫІ

71. Падчас археалагічных даследаванняў трымальнік дазволу штодзённа вядзе палявую дакументацыю.

72. Чарцёжная і графічная дакументацыя павінна дакладна адлюстроўваць усе назіранні даследчыка, у тым ліку ўзаемнае размяшчэнне слаёў і пабудоў, суадносіны іх глыбіні размяшчэння, склад, структуру і колер культурнага пласта (слоя), наяўнасць грунтовых, попельных, вугальных і іншых плям, распаўсюджванне археалагічных артэфактаў па плошчы раскопу, умовы і глыбіні іх залягання, размяшчэнне касцявых рэшткаў.

73. Дапускаюцца наступныя маштабы палявых чарцяжоў: 1:1, 1:2, 1:5, 1:10, 1:20, 1:50.

Планы, разрэзы і профілі раскопаў выконваюцца ў адзіным маштабе, аднак не менш за 1:20/1:40, а для помнікаў каменнага веку – не менш за 1:10/1:20.

Планы курганоў – не менш за 1:20/1:40.

Планы і разрэзы каменных канструкцый павінны быць выкананы ў маштабе не менш за 1:20.

Планы і разрэзы пахаванняў складаюцца ў маштабе не менш за 1:10/1:20.

Уся чарцёжная дакументацыя павінна мець лінейны маштаб.

74. Палявы дзённік лічыцца асноўным палявым дакументам і не можа быць заменены іншымі запісамі. У палявы дзённік заносяцца ўсе назіранні падчас археалагічных палявых работ, асноўныя паказчыкі, апісанні і прамеры з планаў і чарцяжоў, асаблівасці выяўлення і фіксацыі археалагічных аб’ектаў і археалагічных артэфактаў, астэалагічных, палеабатанічных знаходак.

75. Вынікі камеральных работ з атрыманымі археалагічнымі матэрыяламі і апрацаваная палявая дакументацыя разам з фотаздымкамі прадстаўляюцца ў навуковай справаздачы.

Навуковая справаздача павінна адлюстроўваць усе праведзеныя віды археалагічных даследаванняў, на якія выдаваўся дазвол.

Пры вядзенні палявой дакументацыі і падрыхтоўцы навуковай справаздачы павінны выкарыстоўвацца базавыя дапаможнікі па палявой археалогіі.

76. Навуковая справаздача з’яўляецца навуковым творам, які быў выкананы ў якасці службовага задання і на які распаўсюджваецца заканадаўства аб аўтарскім праве і сумежных правах.

У тых выпадках, калі ў стварэнні навуковай справаздачы прымалі ўдзел іншыя супрацоўнікі (акрамя трымальніка дазволу), то іх удзел павінен быць адзначаны ў змесце навуковай справаздачы і тэкставай частцы. Па прапанове трымальніка дазволу прозвішчы гэтых асоб могуць быць адзначаны на тытульным лісце навуковай справаздачы.

## ГЛАВА 6
## СТРУКТУРА НАВУКОВАЙ СПРАВАЗДАЧЫ
## І ПАТРАБАВАННІ ДА ЯЕ АФАРМЛЕННЯ

77. Навуковая справаздача павінна адпавядаць патрабаванням, прадугледжаным артыкулам 91 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, а таксама ўключаць наступныя дадзеныя:

мэты і задачы, якія ставіў перад сабой даследчык, і ступень іх выканання ў палявым сезоне;

сувязь археалагічных палявых работ, што выконваліся, з папярэднімі археалагічнымі даследаваннямі тых самых археалагічных аб’ектаў ці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак;

арганізацыя работ і крыніцы фінансавання;

асноўныя ўдзельнікі археалагічных даследаванняў і іх функцыі;

методыка археалагічных палявых работ;

перспектывы і планы далейшых археалагічных даследаванняў тых самых археалагічных аб’ектаў ці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак.

78. Навуковая справаздача афармляецца друкаваным тэкстам (з дадаткамі) на беларускай або рускай мове ў папяровым і электронным (на электронным носьбіце) выглядзе.

Калекцыйныя вопісы, карты, чарцяжы, фотаздымкі і малюнкі прыкладаюцца да навуковай справаздачы ў форме дадатку пасля асноўнага тэксту або афармляюцца ў выглядзе асобнага альбома. Фармат папяровага ліста навуковай справаздачы і альбома (як правіла, А4) не павінен перавышаць 45 х 32 см.

Выкарыстоўваецца агульная нумарацыя старонак, якая пачынаецца з тытульнага ліста і ўключае ілюстратыўную частку з дадаткамі. У навуковых справаздачах, якія складаюцца з некалькіх тамоў, нумарацыя старонак даецца для кожнага тома асобна.

Навуковая справаздача прадстаўляецца ў папцы, падрыхтаванай да пераплёту, з двума тытульнымі лістамі або ў цвёрдым пераплёце (акрамя пластыкавага).

79. Навуковая справаздача завяраецца подпісам і пячаткай кіраўніка навуковай арганізацыі або музея, якія хадайнічалі аб выдачы дазволу, і зацвярджаецца НАН Беларусі.

Тытульны ліст навуковай справаздачы афармляецца згодна з дадаткам да дадзенай Інструкцыі.

80. Пасля тытульнага ліста навуковай справаздачы прыкладаецца дазвол, затым – змест, уводзіны, асноўны тэкст, заключэнне і дадаткі (калекцыйныя вопісы індывідуальных і масавых археалагічных артэфактаў, спіс ілюстрацый (малюнкаў, фотаздымкаў), ілюстрацыі, дадзеныя антрапалагічнага, астэалагічнага, палеабатанічнага, прыродазнаўчых вызначэнняў, звесткі (даведка) аб перадачы археалагічных артэфактаў на пастаяннае (часовае) захаванне ў адпаведнасці з заканадаўствам). Інфармацыя аб артэфактах у звестках аб перадачы павінна адпавядаць калекцыйным вопісам навуковай справаздачы.

81. Уводзіны змяшчаюць дадзеныя аб месцы правядзення работ, археалагічных аб'ектах, задачах археалагічнага даследавання, арганізацыі работ, крыніцах іх фінансавання і тэрмінах правядзення, аб агульным складзе ўдзельнікаў археалагічных палявых работ.

Асноўная частка навуковай справаздачы ўключае апісанне методыкі археалагічнага даследавання, працэсу і вынікаў археалагічных палявых работ, вынікаў камеральных работ і папярэдняга аналізу атрыманых археалагічных артэфактаў, інфармацыю аб фактах і метадах выкарыстання металашукальнікаў, геарадараў і іншых тэхнічных сродкаў і інструментаў, а таксама інфармацыю аб кансервацыі раскопаў, іх засыпцы, рэкультывацыі глебы на месцы раскопак, узнаўленні надмагільных канструкцый і пабудоў.

Заключэнне змяшчае асноўныя вынікі праведзеных археалагічных даследаванняў, а таксама (калі неабходна) рэкамендацыі па далейшым вывучэнні і выкарыстанні археалагічнага аб'екта.

Дадаткі павінны змяшчаць:

калекцыйны вопіс знаходак (індывідуальных, масавых), які павінен утрымліваць указанне на парадкавы і калекцыйны нумар знаходкі, каардынаты знаходкі (квадрат, пласт, глыбіня), назву знаходкі, матэрыял знаходкі, а таксама быць звязаны з тэкстам, ілюстрацыямі (фотаздымкамі), вызначэннямі шляхам адпаведных спасылак;

фотаздымкі, якія адлюстроўваюць усе стадыі археалагічнага даследавання, у тым ліку планы і профілі раскопаў, разрэзы курганных насыпаў, выяўленыя археалагічныя аб'екты і працэс іх даследавання, павінны выконвацца з маштабнай лінейкай і пазначэннем напрамкаў свету;

інфармацыю аб правядзенні спецыяльных аналізаў і вызначэнняў з указаннем іх аўтарства і пазначэннем месца ўзяцця проб на адпаведнай чарцёжнай дакументацыі.

82. Пасля тэкставай часткі і дадаткаў навуковай справаздачы ставіцца подпіс аўтара(аў).

83. Чорна-белыя чарцяжы выконваюцца тушшу або рапідографам на паперы, кальцы, мілімітроўцы.

Дапускаецца прадстаўленне чорна-белых чарцяжоў у выглядзе ксеракопіі, а таксама каляровых ілюстрацый.

84. Буйнафарматныя чарцяжы, якія нельга паменшыць, павінны складвацца да памераў альбома ці тэксту навуковай справаздачы. Прадстаўленне чарцяжоў у рулонах не дапускаецца.

85. Кожны чарцёж, у тым ліку карты, планы, профілі, разрэзы, павінны мець расшыфроўку ўсіх выкарыстаных умоўных абазначэнняў. Дапускаецца вынясенне расшыфроўкі на асобны ліст (пры ўмове выкарыстання ў навуковай справаздачы адзінай сістэмы ўмоўных абазначэнняў).

Усе чарцяжы павінны мець указанне напрамкаў свету і лінейны паказальнік маштабу.

86. Пры фатаграфаванні ці іншых метадах памяншэння чарцяжоў трэба звяртаць увагу на тое, каб усе дэталі, у тым ліку надпісы і лічбы, былі добра бачны. Не

дапускаецца празмернае памяншэнне чарцяжоў, што вядзе да недастатковай выразнасці копій.

87. На ілюстрацыях (малюнках, фотаздымках) прадстаўляюцца важнейшыя знаходкі (як правіла, усе індывідуальныя знаходкі, а для масавага матэрыялу – найбольш характэрныя рэчы) з указаннем іх калекцыйных нумароў.

Малюнкі і фотаздымкі знаходак павінны мець лінейны паказальнік маштабу. Індывідуальныя знаходкі прадстаўляюцца ў маштабе 1:1, масавыя – 1:2 ці 1:4.

88. Малюнкі і фотаздымкі археалагічных артэфактаў кампануюцца ў табліцы, прычым кожны з іх у табліцы павінен мець свой парадкавы і калекцыйны нумар, на якія робіцца спасылка ў тэкставай частцы і калекцыйным вопісу навуковай справаздачы.

Паміж тэкстам навуковай справаздачы і дадаткамі, у тым ліку калекцыйным вопісам, альбомам ілюстрацый, вызначэннямі, павінна існаваць цесная сувязь у выглядзе адпаведных спасылак.

89. Усе ілюстрацыі, у тым ліку чарцяжы, малюнкі, фотаздымкі, павінны мець тлумачальныя надпісы, якія ўтрымліваюць назву даследаванага археалагічнага аб’екта і вычарпальную інфармацыю аб археалагічным артэфакце. Спіс ілюстрацыйнага матэрыялу не можа замяніць тлумачальных надпісаў.

90. У тлумачальных надпісах пад фотаздымкамі раскопаў і археалагічных аб’ектаў, акрамя назвы здымка з указаннем назвы помніка, года даследавання, неабходна ўказваць, з якога боку фатаграфаваўся раскоп ці археалагічны аб’ект.

## ГЛАВА 7
## НАВУКОВАЯ СПРАВАЗДАЧА АБ АРХЕАЛАГІЧНЫХ РАЗВЕДКАХ

91. Навуковая справаздача аб археалагічных разведках павінна змяшчаць:

апісанне маршруту ці адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі археалагічных разведак з пералікам усіх абследаваных археалагічных аб’ектаў;

карту археалагічнай разведкі з абазначэннем геаграфічных арыенціраў, у тым ліку рэкі, азёры, населеныя пункты, а таксама маршруту археалагічнай разведкі і ўсіх даследаваных археалагічных аб’ектаў;

поўнае апісанне кожнага вывучанага археалагічнага аб’екта з адлюстраваннем яго назвы, геаграфічнага месцазнаходжання, захаванасці, стану паверхні, тапаграфічных асаблівасцей, формы і памераў (калі яны вызначаюцца візуальна), межаў распаўсюджання археалагічных артэфактаў, характарыстыкі культурнага пласта (слоя) (пры правядзенні шурфоўкі) і ўсяго знойдзенага матэрыялу;

інфармацыю аб тым, адкрыты ці абследаваны археалагічны аб’ект упершыню або быў вядомы раней, кім і калі абследаваўся і вывучаўся;

указанне памераў усіх шурфаў, траншэй, зачыстак з адлюстраваннем іх стратыграфіі;

планы і стратыграфічныя профілі ўсіх аб’ектаў незалежна ад наяўнасці ці адсутнасці на іх культурнага пласта (слоя);

апісанне знойдзеных падчас археалагічных разведак археалагічных матэрыялаў.

92. Абследаваныя археалагічныя аб’екты павінны быць пазначаны адпаведным нумарам на карце.

93. Кожны даследаваны археалагічны аб’ект павінен прадстаўляцца ў навуковай справаздачы планам, інструментальным ці візуальным, які складаецца ў пэўным маштабе і адлюстроўвае асаблівасці рэльефу і тапаграфічную сітуацыю. Для гарадзішчаў і іншых археалагічных аб’ектаў з адмысловым рэльефам, як правіла, прадстаўляецца яшчэ разрэз у тым жа маштабе, што і план археалагічнага аб’екта.

94. План археалагічнага аб’екта павінен мець лінейны маштаб, дакладную тапаграфічную прывязку да пастаянных арыенціраў на мясцовасці, у тым ліку ўказанне адлегласці і напрамку да населеных пунктаў, дарог, мастоў, геадэзічных пунктаў, тэлеграфных слупоў. Усе прывязкі павінны быць указаны ў тэксце навуковай справаздачы.

95. Пры адлюстраванні на плане рэльефу з дапамогай гарызанталей павінны ўказвацца берг-штрыхамі напрамак схілу і адзначацца вышыня сячэння гарызанталей.

96. Пры закладцы на археалагічным аб’екце шурфаў, зачыстак і невялікіх раскопаў усе яны павінны быць дакладна і ў маштабе зафіксаваны. У тэксце навуковай справаздачы ўказваюцца іх памеры, а таксама даецца апісанне стратыграфіі і атрыманага археалагічнага матэрыялу.

97. Палявыя фотаздымкі павінны найбольш поўна і падрабязна перадаваць асаблівасці рэльефу, тапаграфічнае становішча абследаваных археалагічных аб’ектаў і іх памер.

Навуковая справаздача павінна ўтрымліваць фотаздымкі ўсіх абследаваных археалагічных аб’ектаў, зачыстак, шурфаў, у тым ліку зачыстак і шурфаў, у якіх культурны слой адсутнічае.

98. Усе знойдзеныя падчас разведак археалагічныя матэрыялы павінны быць апісаны ў тэксце, прадстаўлены ў калекцыйным вопісе індывідуальных і масавых знаходак, а таксама ў дадатках.

## ГЛАВА 8
## НАВУКОВАЯ СПРАВАЗДАЧА АБ АРХЕАЛАГІЧНЫХ РАСКОПКАХ

99. Навуковая справаздача аб археалагічных раскопках павінна змяшчаць:

поўнае апісанне археалагічнага аб’екта, які даследаваўся археалагічнымі раскопкамі, з адлюстраваннем яго назвы, геаграфічнага месцазнаходжання, захаванасці, стану паверхні, тапаграфічных асаблівасцей, формы і памераў (калі яны вызначаюцца візуальна), межаў распаўсюджвання археалагічных артэфактаў, характарыстыкі культурнага пласта (слоя) (пры правядзенні шурфоўкі), усяго знойдзенага матэрыялу і гісторыі вывучэння;

сітуацыйны план археалагічнага аб’екта з дакладным абазначэннем у маштабе ўсіх раскопаў, траншэй, шурфаў, якія закладваліся даследчыкам у адпаведнасці з выдадзеным дазволам, а таксама ў папярэдні час;

апісанне методыкі археалагічных раскопак з абгрунтаваннем яе выбару;

планы і стратыграфічныя профілі ўсіх раскопаў, археалагічных аб'ектаў, мацерыка;

апісанне знойдзеных падчас археалагічных раскопак археалагічных матэрыялаў.

100. Кожны раскоп прадстаўляецца планам, у тым ліку на асобныя пласты, і профілямі сценак раскопу, бровак. Пры значнай глыбіні раскопу і археалагічным даследаванні шматслойных паселішчаў на кожны будаўнічы гарызонт (пласт) павінен рабіцца асобны план з пазначэннем лінейнага маштабу і напрамку свету.

101. На планы раскопу наносяцца:

нівеліровачныя адзнакі (ці прадстаўляецца асобны план нівеліроўкі паверхні) дзённай паверхні і мацерыка. Гэтыя дадзеныя павінны паўтарацца на профілях;

размяшчэнне рэпера, у тым ліку з прывязкай да балтыйскай сістэмы вышынь;

асаблівасці культурнага пласта (слоя);

усе выяўленыя археалагічныя аб'екты, а таксама індывідуальныя знаходкі з адзнакамі іх месцазнаходжання, у тым ліку глыбінь. Усе зафіксаваныя археалагічныя аб'екты нумаруюцца, прычым іх нумар выкарыстоўваецца ў тэкставай частцы навуковай справаздачы і чарцяжах.

102. Планы і профілі раскопу выконваюцца ў адным маштабе. На профілях адзначаюцца межы квадратаў, якія прадстаўлены на плане. У выпадку значнага памяншэння агульнага плана раскопу дапускаецца рабіць планы асобных комплексаў (пабудовы, вогнішчы) у больш буйным маштабе.

Планы і профілі (разрэзы) археалагічных аб'ектаў таксама выконваюцца ў адным маштабе.

103. Пры археалагічным даследаванні ў раскопе каменных, цагляных ці драўляных архітэктурных пабудоў, акрамя іх падрабязнага апісання, планаў і профіляў раскопаў, прадстаўляюцца дакладныя планы пабудоў, разрэзы, фасіроўкі і іншыя архітэктурныя чарцяжы з указаннем лінейнага маштабу.

104. Профілі сценак раскопу ці бровак павінны дакладна адлюстроўваць стратыграфічную сітуацыю. Не дапускаецца абагульненая стратыграфія па некаторых профілях ці стратыграфічныя калонкі, якія адлюстроўваюць толькі частку профілю.

105. Усе выяўленыя ў раскопе археалагічныя аб'екты падрабязна апісваюцца ў тэксце з адзнакамі іх месцазнаходжання, памераў, формы, запаўнення і іншымі характарыстыкамі. На чарцяжах прадстаўляюцца іх профілі (разрэзы) з указаннем лінейнага маштабу.

106. Пакінутыя ў раскопе археалагічныя артэфакты павінны таксама быць адлюстраваны ў навуковай справаздачы з указаннем іх колькасці і фотафіксацыяй.

107. Пры археалагічных раскопках могільнікаў дадаткова прадстаўляецца абгрунтаванне неабходнасці раскопак і выбранай метадыкі. Даецца падрабязная характарыстыка кожнага даследаванага пахавання, усіх выяўленых у іх археалагічных аб'ектаў без залежнасці ад захаванасці, наяўнасці або адсутнасці антрапалагічных парэшткаў і знаходак.

108. На план могільніка з указаннем лінейнага маштабу і напрамкаў свету наносяцца ўсе знойдзеныя пахаванні з дакладным адлюстраваннем месцаразмяшчэння, формы, памераў і арыенціроўкі шкілетаў у магілах.

109. Апісанне кожнага пахавальнага комплексу павінна ўключаць поўную характарыстыку магільнага збудавання з адлюстраваннем памераў, формы, канструктыўных дэталей, запаўнення магільнай ямы, а таксама апісанне палажэння кожнага шкілета ў могільніку, пералік усяго інвентару пахавання з дакладным месцазнаходжаннем кожнай рэчы ў адносінах да шкілета.

Пры апісанні глыбінь неабходна указаць, ад якога ўзроўню праводзілася вымярэнне.

110. Кожнае пахаванне прадстаўляецца асобным планам у маштабе не менш за 1:10/1:20, на якім даюцца дакладныя контуры магільнай ямы (калі яны праглядаюцца), выявы шкілета і ўсіх рэчаў, якія выяўлены пры археалагічных раскопках, а таксама ўсе элементы пахавальнага абраду, у тым ліку падсыпкі, вогнішчы, рэшткі трунаў, з дакладнай фіксацыяй размяшчэння кожнай рэчы ў прасторы і нівелірнымі адзнакамі.

111. На плане ўсе рэчы пахавальнага інвентару і знаходкі з міжмагільнай прасторы нумаруюцца і апісваюцца (расшыфроўваюцца) у тлумачальных надпісах да плана.

112. Пры археалагічных раскопках курганоў прадстаўляюцца планы і, як правіла, не менш двух разрэзаў (профіляў) кожнага кургана, выкананыя ў адным маштабе. На планах і профілях курганоў пазначаюцца нівеліровачныя адзнакі, якія адлюстроўваюць усе асаблівасці будовы насыпаў, пахавальных элементаў і выяўленых пахаванняў. Кожны разрэз кургана апісваецца з указаннем паслядоўнасці размяшчэння пахаванняў і стварэння насыпу.

У выпадку змяшчэння ў навуковую справаздачу паменшанага плана курганоў з выяўленымі пахаваннямі прыкладаецца план асобных пахаванняў у больш буйным маштабе.

113. Кожнае пахаванне прадстаўляецца на фотаздымках.

Тлумачальныя надпісы пад фотаздымкамі, а таксама графічнай дакументацыяй павінны змяшчаць вычарпальную інфармацыю аб праведзеных работах і аб’екце археалагічнага даследавання.

## ГЛАВА 9
## НАВУКОВАЯ СПРАВАЗДАЧА АБ ВЫРАТАВАЛЬНЫХ (АХОЎНЫХ) АРХЕАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯХ

114. Навуковая справаздача аб выратавальных (ахоўных) археалагічных даследаваннях у выглядзе археалагічных разведак і (або) археалагічных раскопак афармляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі глаў 7 і 8 дадзенай Інструкцыі.

115. Акрамя таго, навуковая справаздача аб выратавальных (ахоўных) археалагічных даследаваннях, у тым ліку археалагічным наглядзе, павінна змяшчаць:

вынікі фіксацыі вядомых археалагічных аб’ектаў на праектным матэрыяле;

вынікі абследавання зоны земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ і фіксацыю выяўленых няўлічаных археалагічных аб’ектаў на праектным матэрыяле;

сітуацыйны план размяшчэння аб’екта археалагічнага нагляду ў межах ахоўнай зоны археалагічнага аб’екта;

пазначэнне аб’екта археалагічнага нагляду на тапаграфічнай карце з прывязкай да населеных пунктаў (або ў межах населенага пункта), а таксама на спадарожнікавых здымках;

план зоны земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ і (або) аб’екта археалагічнага нагляду з дакладным абазначэннем у маштабе ўсіх будаўнічых катлаванаў і траншэй з геадэзічнымі (нівеліровачнымі) адзнакамі, таксама на плане абазначаюцца раскопы, участкі праведзеных археалагічных даследаванняў, у тым ліку археалагічнага нагляду;

гістарычную і археалагічную даведку з поўнай характарыстыкай археалагічнага аб’екта, апісаннем месцаразмяшчэння зоны земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ;

характарыстыку методыкі выратавальных (ахоўных) археалагічных даследаванняў, у тым ліку археалагічнага нагляду, з абгрунтаваннем яе выбару;

даведку аб папярэдніх параметрах і плошчы земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ, у тым ліку будаўнічых катлаванаў і траншэй у адпаведнасці з праектным матэрыялам, а таксама інфармацыю аб фактычных аб’ёмах і плошчы праведзеных археалагічных даследаванняў.

116. Прадстаўленне вынікаў археалагічнага нагляду ў зоне земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ ажыццяўляецца ў адпаведнасці з праектным матэрыялам, у якім абазначаны будаўнічыя ўчасткі, катлаваны, траншэі. Пры наяўнасці культурных напластаванняў кожны ўчастак прадстаўляецца графічнай фіксацыяй стратыграфіі сценак і фотафіксацыяй. Даследаваныя значныя археалагічныя аб’екты паказваюцца на асобных планах.

На планах прадстаўляюцца таксама нівеліровачныя адзнакі (ці прадстаўляецца асобны план нівеліроўкі паверхні), якія павінны паўтарацца на профілях сценак будаўнічых катлаванаў і траншэй.

Планы і профілі будаўнічых катлаванаў і траншэй выконваюцца ў адным маштабе. На профілях адзначаюцца межы квадратаў, якія прадстаўлены на плане. У выпадку значнага памяншэння агульных планаў і профіляў робяцца планы асобных археалагічных аб’ектаў у больш буйным маштабе.

Калекцыйны вопіс знаходак (індывідуальных, масавых) павінен мець указанне на парадкавы і калекцыйны нумары знаходкі, лакалізацыю знаходак і быць звязаны адпаведнымі спасылкамі з тэкстам і ілюстрацыйным матэрыялам.

117. Профілі будаўнічых катлаванаў і траншэй, у якіх захаваліся рэшткі культурнага пласта (слоя), павінны дакладна адлюстроўваць стратыграфічную сітуацыю. Не дапускаецца прадстаўленне абагульненай стратыграфіі па некаторых профілях ці стратыграфічных калонках, якія адлюстроўваюць толькі частку профілю.

118. Усе выяўленыя падчас археалагічнага нагляду археалагічныя аб’екты і археалагічныя артэфакты дакладна і падрабязна прадстаўляюцца ў навуковай справаздачы, у тым ліку ў тэкставай частцы, чарцяжах, малюнках і фотаздымках з маштабнай лінейкай і пазначэннем напрамкаў свету.

119. Фотаздымкі, якія прадстаўляюцца ў навуковай справаздачы аб праведзеных выратавальных (ахоўных) археалагічных даследаваннях, павінны адлюстроўваць усе стадыі археалагічных даследаванняў, асаблівасці выбранай методыкі, параметры і плошчу земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ, у тым ліку будаўнічых катлаванаў і траншэй, у адпаведнасці з праектным матэрыялам.

## КОДЕКС РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ ОБ АДМИНИСТРАТИВНЫХ ПРАВОНАРУШЕНИЯХ 6 января 2021 г. № 91-З

**Статья 20.6. Незаконный поиск и оборот археологических артефактов**

1. Поиск археологических артефактов, осуществляемый без разрешения на право проведения археологических исследований, - влечет наложение штрафа в размере от пятнадцати до пятидесяти базовых величин с конфискацией предмета административного правонарушения, орудий и средств совершения административного правонарушения или без конфискации таких орудий и средств.
2. Приобретение, продажа, дарение, мена, залог археологических артефактов в случаях, запрещенных законодательными актами, при отсутствии признаков незаконной предпринимательской деятельности
   - влекут наложение штрафа в размере от десяти до тридцати базовых величин с конфискацией предмета административного правонарушения.

*Примечание. Термин «поиск археологических артефактов», применяемый в настоящей статье, имеет значение, определенное законодательством о культуре.*

**Для запісаў**




Удзельнікі Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Вынікі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі ў 2022 годзе” на археалагічным комплексе на р. Менцы, 17 мая 2023 г.



Вучоныя Інстытута гісторыі НАН Беларусі падчас суботніка на археалагічным комплексе на р. Менцы, 22 красавіка 2023 г.




Студэнты Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава наведваюць Інстытут гісторыі НАН Беларусі падчас летняй палявой практыкі на археалагічным комплексе на р. Менцы, ліпень 2023 г.




Археолагі Інстытута гісторыі НАН Беларусі (А.У. Касцюкевіч, П.М. Кенька, А.В. Вайцяховіч, А.С. Ясковіч, А.М. Аўласовіч) – Лаўрэаты конкурса ТОП 10 дасягненняў вучоных НАН Беларусі за 2023 г.